БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ БАНК
BELARUSKY NARODNY BANK

ОАО «БНБ-Банк»

220012, Республика Беларусь, г. Минск, проспект Независимости, 87а

Консолидированный Бухгалтерский баланс на 1 октября 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018	2017
1	2	3	4	5	6
1	**АКТИВЫ**				
2	Денежные средства	1101		9 796	10 921
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102		-	-
4	Средства в Национальном банке	1103		28 120	38 194
5	Средства в банках	1104		25 407	38 570
6	Ценные бумаги	1105		89 430	56 738
7	Кредиты клиентам	1106		313 801	298 542
8	Производные финансовые активы	1107		3 228	204
9	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108		57	-
12	Основные средства и нематериальные активы	1109		18 425	27 477
13	Доходные вложения в материальные активы	1110		5 748	
14	Имущество, предназначенное для продажи	1111		8 980	3 349
15	Отложенные налоговые активы	1112		-	-
16	Деловая репутация			-	-
17	Прочие активы	1113		5 945	7 451
18	ИТОГО активы	11		508 937	481 446
19	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**				
20	Средства Национального банка	1201		-	-
21	Средства банков	1202		51 171	67 964
22	Средства клиентов	1203		363 099	325 162
23	Ценные бумаги банка	1204		23 323	21 793
24	Производные финансовые обязательства	1205		-	83
25	Отложенные налоговые обязательства	1206		-	-
26	Прочие обязательства	1207		3 098	2 167
27	ВСЕГО обязательства	120		440 691	417 169
28	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**				
29	Уставный фонд	1211		27 688	11 075
30	Эмиссионный доход	1212		-	-
31	Резервный фонд	1213		6 400	6 400
32	Фонд переоценки статей баланса	1214		10 989	11 244
33	Накопленая прибыль	1215		23 169	35 558
34	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации-банку			68 246	64 277
35	Доля неконтролирующих акционеров			-	-
36	ВСЕГО собственный капитал	121		68 246	64 277
37	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12		508 937	481 446

Консолидированный Отчет о прибылях и убытках за 3 квартал 2018 года

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Пункт примечаний	2018 год	2017 год
1	2	3	4	5	6
1	Процентные доходы	2011		25 232	30 050
2	Процентные расходы	2012		10 795	14 554
3	Чистые процентные доходы	201		14 437	15 496
4	Комиссионные доходы	2021		8 312	7 270
5	Комиссионные расходы	2022		2 969	2 402
6	Чистые комиссионные доходы	202		5 343	4 868
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203		-	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204		(96)	(65)
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205		6 258	6 367
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206		3 108	(414)
11	Чистые отчисления в резервы	207		4 589	2 665
12	Прочие доходы	208		4 740	2 598
13	Операционные расходы	209		21 840	16 268
14	Прочие расходы	210		1 404	1 039
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		5 957	8 878
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		1 988	1 196
17	Прибыль (убыток)	2		3 969	7 682
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			-	-
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
20	Итого прибыль (убыток)			3 969	7 682
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации			3 969	7 682
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			-	-
23	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях				
24	Базовая прибыль на простую акцию			-	-
25	Разводненная прибыль на простую акцию			-	-

Генеральный директор С.К. Сабук

Главный бухгалтер Н.П. Шнип

Дата подписания: 21 ноября 2018 года

Данная отчетность размещена на странице интернет-сайта БНБ-Банка: **(https://bnb.by/o-nas/nashi-rezultaty/bukhgalterskaya-otchetnost/)**

Открытое акционерное общество «Белорусский народный банк»
Лицензия на осуществление банковской деятельности, выданная Национальным банком Республики Беларусь, №10 от 07 июня 2013 г.
УНП 100513485.

«МУЖ УГАВАРЫЎ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Паколькі наш дом знаходзіцца побач з трасай, я, напэўна, паўгода не магла прызвычаіцца, што і днём, і ўначы побач едуць машыны. Ну і да каровы не прывыкла дагэтуль. Мне яна даверу не ўнушае. Хоць мы і бычкоў вырошчваем, і роды ў свінкі прымалі, — усміхаецца гаспадыня.

Зрэшты, навучыцца даіць карову Іне ўсё ж такі давялося. Перад апошнім этапам «Уладара сяла», дзе арганізатары маглі зладзіць конкурс па даенні, яна брала ўрокі ў жанчыны, у якой сям'я набывае малако. Праўда, навык так і не спатрэбіўся.

«Суседзі вырашылі, што мы звар'яцелі»

Удзельнічаць у конкурсе Хацкевічам прапанавалі ў ліпені. Але падрыхтоўка была няпростай. Напрыклад, толькі здымкі пяціхвіліннага роліка, каб прадставіць сям'ю, занялі пяць гадзін:

— Калі нам паведамілі, што галоўны прыз — трактар, Коля пагадзіўся і сказаў: мы едзем па трактар, — успамінае Іна. — Патрабаваўся відэаролік пра сям'ю, фотаматэрыялы з сельскім калярытам. Нашы суседзі тады вырашылі, што мы зусім звар'яцелі: ідзём у хлеў — фатаграфуемся.

Да рэспубліканскага этапу, дзе, уласна, і разыгрываўся трактар, маладой сям'і давялося прайсці раённы і абласны этапы, абышоўшы па выніках больш за два дзясяткі іншых сем'яў. Гаспадыня, паводле яе прызнання, хвалявалася за ўсе: за тое, каб выспаліся дзеці, каб не падвяло надвор'е, каб муж не забыў словы. А вось самым цяжкім выпрабаваннем для Мікалая стаў выхад на сцэну. Прычым ужо на раённым этапе.

— Мяне выступленні не палохалі, а вось муж быў сам не свой, — смяецца Іна. — Ён дагэтуль ніколі не выходзіў на сцэну. Я даю яму дзяцей і кажу: я іду першая, ты з дзецьмі — за мной. Там пражэктар свеціць у вочы, усё роўна нічога не бачна. Як я перажывала, што ён не скажа свае словы! Затое «на рэспубліцы» глядзела і не пазнавала: няўжо гэта мой муж?! Яго там так панесла: і камплімент мне зробіць, і руку пацалуе.

Зрэшты, прадэманстраваць журы варта было не толькі творчыя ўменні. Адзін з конкурсаў на рэспубліканскім этапе — пабудаваць падворак. Да яго сям'я Хацкевічаў рыхтавалася дома загадзя. На гэта пайшлі 10 кубоў лесу і тыдзень працы. Гатовы падворак потым перавезлі ў Слуцк, дзе яго заставалася толькі сабраць.

— Ва ўсіх былі больш простыя варыянты, напрыклад палатка. А ў нас сапраўдная палова сялянскага дома — з бярвення, з акном, дахам, на даху — конь, ахоўнік дома, — расказвае жанчына. — У Слуцку збіраць пачалі яшчэ з вечара, Мікалаю дапамаглі бацька і мой брат. А я, мая свякроў і мама, а таксама цёткі дапамагалі накрываць на стол: нарыхтоўкі, пірагі, гусака — усё гатавалі дома і везлі з сабой.

Падтрымаць сям'ю ў фінале ў Слуцк прыехала 20 чалавек — сваякі і сябры. Астатнія 30 месцаў у аўтобусе займалі стравы, на падлозе размяшчаўся разабраны падворак. Яго, дарэчы, Хацкевічы пакінулі ў падарунак арганізатарам, сабе на памяць забралі толькі драўлянага каня.

Найлепшы час сям'я прадэманстравала амаль ва ўсіх конкурсах:

— Калі завяршылася прэзентацыя падворка, мы цалкам разняволіліся. Быў конкурс, дзе трэба было лазіць курэй. Кожная з дзвюх удзельніц павінна злавіць па пяць штук. А нам выпусцілі чамусьці не 10, а 11. І пакуль мая саперніца злавіла трох курыц, у мяне было ўжо шэсць, — успамінае Іна.

А з лаўкай, якую трэба было на хуткасць змайстраваць з 6-метровай дошкі з дапамогай цвікоў, малатка і нажоўкі, Хацкевічы ўвогуле справіліся ў рэкордны тэрмін. Прычым яна мусіла быць са спінкай, а заданне лічылася выкананым, калі на лаўцы размесціцца ўся сям'я.

— За тыдзень мы ведалі, што будзе такі конкурс. Іна казала: давай патрэніруемся, — успамінае Мікалай. — Я ж вырашыў не пераводзіць марна дошкі. Па дарозе ў Слуцк прыкінуў, як гэта можна хутка зрабіць.

У выніку большасць удзельнікаў справілася з заданнем за 12 хвілін, а Хацкевічы — у тры разы хутчэй!

Наступствы аднаго з апошніх конкурсаў, нягледзячы на яго немудрагелістасць, нагадвалі пра сябе гаспадару ўсе апошнія месяцы — Мікалай атрымаў сур'ёзны апёк. Сям'я гатавала «дранікі на калодзе» — таксама на хуткасць.

— У канцы варта было прыбраць патэльню з калоды. А ў мітусні знікла наша аднімка, — успамінае гаспадар. — Я ўхапіў патэльню рукой. Кіпячы алей выліўся мне на другую руку... Прыйшлося выклікаць хуткую. Тым часам пачалося ўзнагароджанне. Я сяджу ў машыне хуткай дапамогі і праз акно бачу, што Іна з дзецьмі пайшла на сцэну. А ўрачы не ведаюць, што рабіць з маім апёкам: настойваюць на шпіталізацыі, маўляў, у цябе рука да локця ў пухірах. А я спрачаюся і прашу абязболіць. Нарэшце яны пагадзіліся, і калі лекі падзейнічалі, адчуў, што адключаюся. У прытомнасць прыводзілі нашатыром, з ім у выніку і стаяў на сцэне.

— Я бачыла, што муж дрэнна сябе адчувае, але віду стараецца не паказваць, вельмі баялася, каб ён не ўпаў. Яшчэ і малодшы сын пачаў засынаць на сцэне, я не ведала, каго з іх мне трымаць, — успамінае Іна. — І тут аб'яўляюць: пераможцы конкурсу — сям'я Хацкевічаў...

З удачай па жыцці

У падарунак яны атрымалі мотакультыватар і грашовы сертыфікат на 1960 рублёў. Іна і Мікалай прызнаюцца, што і яны ўклалі ва ўдзел у гэтым праекце шмат намаганняў, часу і сродкаў. І на пытанне, ці паўтарылі б, калі б ведалі, праз што давядзецца прайсці, адказваюць: не ўпэўнены.

— Мы гэта ўспамінаем, як сямейную прыгоду. У нас ёсць вялікая праблема — мы не ўмеем адпачываць, — кажа Іна. Мікалай дадае: — Увесь час працуем, зарабляем, нешта набываем — і зноў працуем. Атрымліваецца замкнёнае кола. Гэта быў своеасаблівы забаўляльны тур па Беларусі. Мы пабывалі ў Шаркаўшчыне (на абласным этапе. — **Аўт.**), Слуцку, пасля конкурсу двойчы ездзілі ў Мінск. Нам зладзілі экскурсіі па Палацы Незалежнасці, Палацы Рэспублікі, Нацыянальным мастацкім музеі.

— Мікалай сядзіць у тэатры і кажа: «У мяне дома столькі работы, а я тут!» — усміхаецца Іна, даючы зразумець, што адпачываць ім яшчэ вучыцца і вучыцца.

Гэта і не дзіўна, бо адпачываць у вёсцы не даводзіцца нават у лістападзе, калі скончыліся работы на зямлі. Муж і жонка ўстаюць а палове шостай, а заканчваецца іх дзень часам за поўнач.

— Устаю, дапамагаю сынам сабрацца ў садок, потым кормім жывёлу, муж адвозіць дзяцей, а я еду на работу. Днём мы абодва занятыя. Увечары трэба зноў пакарміць жывёлу. Сыны просяць пагуляць з імі ці вершык трэба вывучыць, а яшчэ — мыць, прыбіраць, гатаваць... І толькі ў выхадныя думаеш: сёння я рана лягу спаць. Праўда, гэта ўсё роўна рэдка атрымліваецца, — з усмешкай кажа Іна.

Чым заняць сябе на вёсцы, калі вольны час усё ж з'яўляецца? Ды хоць бы спяваць. Хоць раней Іна не займалася спевамі, у Вяжышчы яе запрасілі ў мясцовы калектыў «Рэха». Удзельніцы хору спяваюць для сябе, а таксама наведваюцца з канцэртамі ў суседнія вёскі і раённы цэнтр — Бешанковічы. Спяваюць у калектыве і сыны Іны. А таксама вывучаюць азы ігры на гармоніку разам з педагогам.

— Я даўно казаў Іне, што яна прыцягвае ўдачу, — усміхаецца Мікалай. — Адразу пасля перамогі ва «Уладары сяла» яна выйграла ў адным з конкурсаў 40 літраў паліва. І на рабоце (Іна працуе кухарам. — **Аўт.**) — толькі яна выйшла з дэкрэтнага адпачынку, наведвальнікаў адразу стала ўдвая больш.

Іна не спрачаецца і дадае, што знаёмыя ёй раяць... пагуляць у «Суперлато». Хоць здаецца, галоўны шчаслівы білет у сваім жыцці яна ўжо выцягнула: сваіх любімых мужчын — сыноў Аляксея і Аляксандра і мужа Мікалая.

Алена КРАВЕЦ.
Фота Андрэя САЗОНАВА.
Бешанковіцкі раён.

Больш фота глядзіце на сайце www.zviazda.by